***З ЛЮБОЎЮ І КЛОПАТАМ ПРА БЕЛАРУСЬ***

**Федарук А.Т. Старинные усадьбы Минского края. – Мн.: Полифакт, 2000. – 416 с.; Федарук А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины. –2-е изд. – Мн.: БелЭн, 2006. – 576 с.**

Гэтыя два шыкоўна выдадзеныя фаліянты – бясцэнны дар нашым мастацтвазнаўцам, краязнаўцам, ды і ўсім, хто цікавіцца мінулым Бацькаўшчыны, хто любіць Беларусь.

Са старонак прыгожа і прадумана афармленых кніг гарманічна паўстаюць гісторыя і сучаснасць, культура ў многіх яе праявах, праглядаюцца некаторыя дэталі сацыякультурнага жыцця. Таму з упэўненасцю можна сказаць, што кнігі “Старинные усадьбы Минского края” и “Старинные усадьбы Берестейщины” – велізарная ўдача аўтара. Непасрэдна аб гэтым сведчыць паўторнае выданне апошняй. Яно стала магчымым дзякуючы Беларускаму рэспубліканскаму фонду фундаментальных даследаванняў, Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ, Брэсцкаму абласному камітэту прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрству інфармацыі РБ. Аднак гэта ўдача абумоўленая: яна вынік скрупулёзных пошукаў аўтара ў архівах і бібліятэках Беларусі і суседніх краін на працягу чатырох дзесяцігоддзяў. А.Т.Федарук правёў аналітычную працу над старадаўнімі дакументамі, у першую чаргу Метрыкай ВКЛ, мемуарнай літаратурай, асабістымі архівамі і мастацкай спадчынай нашых суайчыннікаў – Н.Орды, Я.Булгака і інш.

Аўтар абсалютна правы, калі сцвярджае: “Сядзібы ў мінулым з’яўляліся найбольш выразнымі культурнымі і эканамічнымі ўтварэннямі Беларусі. Сядзібы – гэта не толькі бляск свецкай культуры, асяродак спалучэння культурных, духоўных і інтэлектуальных каштоўнасцей. Яны з’яўляліся развітымі гаспадарчымі комплексамі, нярэдка паказальнымі гаспадаркамі ...” Аўтар рознабакова даследаваў сотні сядзіб Міншчыны і Берасцейшчыны, большую палову іх апісаў поўна і дакладна.

Кнігі А.Т.Федарука з’яўляюцца каштоўнейшай крыніцай для студэнтаў і выкладчыкаў БДУ культуры і мастацтваў пры вывучэнні гісторыі матэрыяльнай культуры, сацыяльнай і эканамічнай гісторыі. Акрамя гэтага, на наш погляд, матэрыял кніг дае выключную магчымасць пазнаёміцца з жыццём і дзейнасцю гаспадароў сядзіб, пранікнуцца атмасферай мінулых дзён, убачыць, што жыццё на беларускіх землях развівалася па тых жа заканамернасцях, што і ў іншых еўрапейскіх краінах. У нас стагоддзямі жылі і працавалі пакаленні таленавітых і культурных гаспадароў. У іх ліку Вайніловічы, Ваньковічы, Ельскія, Друцкія-Любецкія, Орды, Бохвіцы, Скірмунты і многія іншыя. Гаспадарчы і культурны ўклад іх сядзіб, безумоўна, не мог не аказваць прыметны ўплыў на жыццё навакольнага асяроддзя. Можна сказаць, што культурная спадчына нашага перадавога дваранства адчуваецца і сёння, аб чым яскрава сведчаць і тэкст, і ілюстрацыйны матэрыял кніг А.Т.Федарука. Многія з нас могуць назваць эканамічна і культурна значныя сёння вёскі і пасёлкі, асабліва ў сваіх родных мясцінах. Для аўтара выказваемых думак гэта перш за ўсё Парэчча і Моладава, Погост, Дубай і іншыя сялібы на роднай Піншчыне, якія да нашага часу вылучаюцца сярод суседніх населеных пунктаў. Вельмі блізкія мне як аўтару гэтых радкоў мясціны таксама ўпамінаюцца аўтарам, але, на жаль, толькі два разы і апраўдана негатыўна, бо, што мелі, не захавалі ...

Сядзібы нашых продкаў – гэта не проста пабудовы, а ў многім – творы мастацтва, аб чым сведчаць шматлікія цудоўныя ілюстрацыі і апісанні. Аўтар заўважае, што праблема старадаўніх сядзіб – гэта не настальгія. Безумоўна, ён мае рацыю, аднак з гэтым нельга поўнасцю пагадзіцца, таму што змест кніг, перш за ўсё іх гістарычныя часткі, настолькі разварушваюць душу, што да настальгіі не так ужо і далёка.

Можна сказаць, што названыя кнігі вылучаюцца сярод тых нямногіх, якія ўводзяць чытачоў у свет пачуццяў, паўсядзённага жыцця нашых продкаў. Мы лепш ведаем расійскую дваранскую культуру, асабліва мастацкую, часцей чытаем літаратуру, прысвечаную дваранству Расіі, ведаем многіх з яго прадстаўнікоў. Успомнім “дваранскія гнёзды”, якія паўстаюць са старонак твораў І.С.Тургенева, І.А.Ганчарова, п’ес А.М.Астроўскага і іншых, а пра свае шляхецкія гнёзды ведаем значна менш. Чаму так атрымалася, асобая размова. Кнігі А.Т.Федарука ў пэўнай ступені запаўняюць гэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прабел. Толькі вельмі шкада, што даступныя яны нешырокаму колу чытачоў, асабліва першая, якая выдадзена толькі 500 асобнікамі. Але мы спадзяёмся, што кожны чытач, улюблёны ў родную Беларусь, асабліва настаўнікі школ і выкладчыкі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, захочуць расказаць у сваім асяроддзі, сваім навучэнцам пра слаўнае мінулае нашай краіны.

Менавіта мне як выкладчыку і дарагія названыя кнігі тым, што змешчаныя ў іх звесткі дапамагаюць папоўніць матэрыял па курсу гісторыі Беларусі цікавымі фактамі, разважаннямі, фарміраваць у навучэнцаў гонар за сваю Беларусь, яе слынных людзей. І выказаныя на прапануемых чытачу старонках нашы думкі – гэта перш за ўсё думкі чалавека, які мае дачыненне да выхавання моладзі.

Карысныя звесткі ўтрымліваюць матэрыялы, што дапаўняюць мастацтвазнаўчую частку работы. Шмат новага можна даведацца з тэкстаў, якія суправаджаюць апісанні сядзіб у Высокім, Дудзічах, Луніне, Парэччы, Паланечцы і іншых месцах: тут і радаводы, і сямейныя сувязі, і гаспадарчыя інтарэсы, і эканамічныя вынікі, і рэдкія факты. Можна даведацца, напрыклад, пра лёс партрэта Пелагеі Сапегі, гаспадарчыя поспехі яе праўнучкі М.К.Патоцкай у Высокім, лёс М.Радзевіч, унутранае ўбранства палаца ў Моладаве і інш.

На наш погляд, больш прадумана аформлена першая кніжка "Старинные усадьбы Минского края", таму што да апісання дадаецца міні-карта, якая дазваляе дакладна ўявіць месцазнаходжанне канкрэтнай сядзібы. Акрамя гэтага, на палях утрымліваюцца кароценькія, але надзвычай цікавыя звесткі. Напрыклад, адна з іх аб тым, што Гіём Апалінэр, сусветна вядомы французскі паэт, у якасці псеўданіма ўзяў імя дзеда М.А.Каструвіцкага, рэвалюцыянера, які эмігрыраваў за мяжу пасля паўстання 1863 г. З гэтага роду паходзіў і Карусь Каганец, які даводзіўся Г.Апалінэру стрыечным братам. Ён стаў сусветна вядомым паэтам, буйнейшым рэфарматарам паэзіі XX ст. Ці яшчэ адзін вельмі характэрны факт, але ўжо з эканамічнага жыцця: згодна звестак у 1908 г. пітомнік у маёнтку Ігнацічы, які належаў В.Ельскаму (сёння гэта вёска Калініна каля Самахвалавіч), прапаноўваў 643 гатункі руж, з іх 160 зусім новыя, 48 відаў саджанцаў хвойных і 203 – ліставых дрэў.

***<u>Прадуманае мастацкае і паліграфічнае афармленне кніжак служыць выразным прыкладам дасягненняў у галіне кнігавыдавецтва, а таксама кнігазнаўства.</u>***

На наш погляд, змест кніжак мог быць яшчэ больш паўнавартасным, калі б у іх былі змешчаны сучасныя карты Міншчыны і Берасцейшчыны з пазначанымі на іх старадаўнімі сядзібамі. Можна было б звярнуць увагу і на наяўнасць пэўных недакладнасцей, аднак яны не ўплываюць на агульнае добрае ўражанне і зусім не зніжаюць навуковую і пазнавальную каштоўнасць працы А.Т.Федарука.

Яшчэ раз падкрэслім, што наш вопыт як вопыт выкладчыка пераконвае: кнігі вельмі карысныя пры выкладанні мастацтвазнаўчых, музеязнаўчых дысцыплін, гісторыі, культуралогіі, краязнаўства, кнігазнаўства і некаторых іншых. Вялікую цікавасць у навучэнцаў выклікае ілюстрацыйны матэрыял.

Падсумоўваючы сказанае, улічваючы тыя пачуцці, што выклікаюць кнігі А.Т.Федарука, можна з упэўненасцю сказаць: аўтар зрабіў значны ўнёсак у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі, пазнанне яе мінуўшчыны.

***М.А.Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ